**РАБОТНІКІ ВНУ І ТЭХНІКУМАЎ! РЫХТУЙЦЕ ІДЭЙНА ЗАГАРТАВАНЫХ, ВЫСОКАКВАЛІФІКАВАНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ! РАЗВІВАЙЦЕ НАВУКУ, УМАЦОЎВАЙЦЕ СУВЯЗЬ З ВЫТВОРЧАСЦЮ!**

*(З ЗАКЛІКАЎ ЦК КПСС ДА 64-й ГАДАВІНЫ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ).*


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1981
15
КАСТРЫЧНІКА
ЧАЦВЕР
№ 28 (1328)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА





## ПА ПУЦЁЎКАХ

прафкома БДУ імя У. І. Леніна 712 студэнтаў адпачывала летам у спартыўна-аздараўленчым лагеры «Нарач». З іх 168 —замежныя студэнты. У падобных лагерах Ерэванскага і Калінінградскага універсітэтаў пабывалі 30 чалавек па абмену. Правялі лета ў дамах адпачынку — 16 студэнтаў, санаторыях —24, на турысцкіх базах — 33. У Крыму, непадалёку ад Ялты, працаваў лагер працы і адпачынку. За дзве змены ён прыняў каля 80 чалавек.

А. КІШКЕВІЧ,
намеснік старшыні прафкома.

## СВЯТОЧНЫ ВЕЧАР

адбыўся ў клубе інтэрната № 7. Ён быў прысвечаны 32 гадавіне ўтварэння Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Лекцыя аб сённяшнім дні рэспублікі, канцэрт мастацкай самадзейнасці, дыскатэка склалі яго праграму. Гаспадарамі святочнага мерапрыемства былі нямецкія студэнты.

Т. СОТЧАНКА,
сакратар камітэта камсамола філфака.

## КІНАУНІВЕРСІТЭТ

«Кіно і час» працягвае сваю работу. Рыхтуецца творчая сустрэча з заслужаным артыстам РСФСР Ігарам Дзмітрыевым. Будуць дэманстравацца фрагменты з фільмаў, у якіх здымаўся акцёр.

Т. ІВАНОВА.

## ПАЧАЛІСЯ РЭПЕТЫЦЫІ

зводнага хору замежных студэнтаў, якія навучаюцца ў БДУ. Мастацкі кіраўнік Т. Л. Бажко развучвае з прадстаўнікамі розных краін «Гімн дэмакратычнай моладзі», які будзе выкананы ў час святочнага канцэрта, прысвечанага 60-годдзю універсітэта.

Э. АНІСЕНКА,
мастацкі кіраўнік студэнцкага клуба.

## ДЗЕНЬ ДОНАРА

праводзіцца з 20 па 22 кастрычніка палiклінікай БДУ. Запрашаюцца ўсе студэнты і супрацоўнікі.

М. ЛАХВІЧ.

# У напрамку ўдасканалення

### З XXV СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНАЙ ПРАФСАЮЗНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ СУПРАЦОЎНІКАЎ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

9 кастрычніка ў актавай зале галоўнага корпуса прайшла XXV справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя супрацоўнікаў універсітэта.

Са справаздачным дакладам выступіў старшыня мясцкома дацэнт Э. В. Шастаковіч. Прафесар кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў К. К. Герман выступіў па пытанні ўзмацнення ролі прафсаюзаў у выхаваўчай рабоце; намеснік дырэктара па навуковай рабоце НДІ ФХП дацэнт Г. А. Браніцкі засяродзіў увагу дэлегатаў на задачах прафсаюзных арганізацый навукова-даследчых падраздзяленняў у павышэнні эфектыўнасці і якасці вучэбнага працэсу; старшыня камісіі мясцкома П. І. Гапонік паведаміў аб рабоце мясцовага камітэта па забеспячэнню здаровых і бяспечных умоў працы, быту і адпачынку супрацоўнікаў; інжынер-тэхнолаг СКТБ з ВВ А. Г. Калтыгін прысвяціў сваё выступленне калектыўнаму дагавору і яго значэнню ў рашэнні вытворчых і сацыяльных пытанняў у калектыве; дацэнт ФПМ Г. В. Мацвееў спыніўся ў прамове на ролі прафсаюзных бюро факультэтаў у рэалізацыі задач, якія стаць перад прафсаюзнай арганізацыяй універсітэта; член арганізацыйна-масавай камісіі мясцкома дацэнт У. Т. Шалатонін выступіў па пытанню далейшага ўдасканалення стылю і метадаў работы прафсаюзнай арганізацыі; аб практыцы работы прафсаюзнай групы расказаў праформ кафедры агульнай фізікі С. С. Вятохін; метадыст фізічнага факультэта М. І. Юзэфовіч звярнуў увагу дэлегатаў канферэнцыі на неабходнасць паляпшэння работы сістэмы грамадскага харчавання; загадчык кафедры ядзернай фізікі С. С. Шушкевіч выказаўся па пытанню неадкладнага расшырэння эксперыментальнай базы універсітэта.

На канферэнцыі з вялікай прамовай выступіў дэлегат XXVI з'езда КПСС, акадэмік АН БССР, рэктар Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна У. А. Белы. Ён прысвяціў сваё выступленне пытанням далейшага ўдасканалення работы прафсаюзнай арганізацыі і перспектывам развіцця універсітэта.

Тэкст справаздачнага даклада прапануем у скарачэнні.

* * *

ДВА ГАДЫ работы цяперашняга саставу мясцовага камітэта (з лістапада 1979 па кастрычнік 1981 г.) супалі з вельмі адказным перыядам у жыцці нашай краіны. Гэта быў час завяршэння савецкім народам планаў X пяцігодкі і дастойнай сустрэчы XXVI з'езда нашай партыі, гістарычныя рашэнні якога выклікалі вялікі прыліў творчай энергіі і ініцыятывы савецкіх людзей.


(Заканчэнне на 2-й і 3-й стар.).





### РЭКТАРАТУ, ПАРТКОМУ, КАМІТЭТУ КАМСАМОЛА, ПРАФКОМУ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

**Шклоўскі райком КП Беларусі, выканком раённага Савета народных дэпутатаў, райком ЛКСМБ шчыра дзякуюць калектыву студэнтаў і выкладчыкаў геаграфічнага факультэта і факультэта прыкладной матэматыкі Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна за дзейсную дапамогу ў правядзенні ўсяго комплексу восеньскіх сельскагаспадарчых работ у калгасах і саўгасах нашага раёна ў 1981 годзе.**

**Працаўнікі раёна ў бягучым годзе сабралі з кожнага гектара па 19,5 цэнтнеры зерневых, 200 цэнтнераў бульбы, засыпалі ў закрамы Радзімы 28 тысяч тон зерня.**

**Гэтыя дасягненні ў гэтым сельскагаспадарчым годзе мы падзяляем з байцамі зводнага сельскагаспадарчага атрада універсітэта, якія, пранікшыся клопатам аб лёсе ураджаю, які вырасцілі сельскія працаўнікі, аказалі вялікую дапамогу ў паспяховым завяршэнні ўборкі льну, бульбы, караняплодаў, нарыхтоўкі кармоў, выкананні раёнам планаў паставак дзяржаве прадуктаў земляробства.**

**З глыбокім задавальненнем мы адзначаем актыўны ўдзел студэнтаў і выкладчыкаў у маса-палітычнай рабоце на сяле. Байцы атрада для працаўнікоў сельскай гаспадаркі прачыталі 154 лекцыі, паставілі 42 канцэрты мастацкай самадзейнасці, аказалі шэфскую дапамогу 144 ветэранам партыі, вайны і працы.**

**Мы выражаем цвёрдую ўпэўненасць у тым, што нашы сяброўскія дзелавыя сувязі, якія сталі ўжо традыцыйнымі, і далей будуць мацавацца, пашырацца і садзейнічаць паспяховаму выкананню працаўнікамі раёна рашэнняў XXVI з'езда КПСС, намечаных рубяжоў адзінаццатай пяцігодкі ў сельскагаспадарчай вытворчасці.**

**Прыміце нашы шчырыя пажаданні добрага здароўя, вялікага асабістага шчасця, новых поспехаў і творчых здзяйсненняў у высакароднай справе навучання і выхавання будучых спецыялістаў народнай гаспадаркі.**

**ШКЛОЎСКІ РАЙКОМ КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ
ВЫКАНКОМ ШКЛОЎСКАГА РАЁННАГА САВЕТА НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ
РАЙКОМ ЛКСМБ**

# У НАПРАМКУ ЎДАСКАНАЛЕННЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Калектыў нашага універсітэта з гонарам выканаў сацыялістычныя абавязацельствы 1980 года — завяршаючага года 10-й пяцігодкі і другі раз запар выйшаў пераможцам Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва сярод ВНУ краіны. За актыўнае ажыццяўленне рашэнняў XXV з'езда КПСС, паспяховае выкананне плана сацыяльнага і эканамічнага развіцця краіны і заданняў дзесятай пяцігодкі, павышэнне эфектыўнасці і якасці ідэйна-выхаваўчай, вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы, за падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў універсітэту ў 1979 і 1980 гг. прысуджаўся Пераходны Чырвоны Сцяг Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК галіновага прафсаюза з першай грашовай прэміяй. Такой жа высокай узнагароды быў удастоены ў 1980 годзе і навукова-даследчы інстытут прыкладных фізічных праблем.

За актыўную садружнасць з вытворчасцю і аказанне дапамогі ў пытаннях навукова-тэхнічнага прагрэсу нашаму калектыву па выніках 1980 года прысуджаны Пераходны Чырвоны Сцяг Мінскага абкома КПБ.

Зроблена шмат, і каб захаваць набранае паскарэнне, забяспечыць выкананне задач новай пяцігодкі, усе нашы пярвічныя прафсаюзныя арганізацыі, мясцовы камітэт заклікаьы пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі пастаянна ствараць у калектыве абстаноўку высокай патрабавальнасці, арганізаванасці, дысцыпліны, творчых адносін да справы, усямерна паляпшаць арганізатарскую і выхаваўчую работу.

Дасягнуць гэтага магчыма толькі шляхам далейшага ўдасканалення стылю і метадаў работы. Таму цяперашні састаў мясцовага камітэта пачаў сваю работу з аналізу тых крытычных заўваг, якія былі выказаны на справаздачна-выбарных прафсаюзных сходах факультэтаў і мінулай агульнауніверсітэцкай канферэнцыі. Быў распрацаваны план мерапрыемстваў па рэалізацыі гэтых крытычных заўваг і яны ж з'явіліся адпраўным момантам планавання работы мясцовага камітэта, яго пастаянных камісій і прэзідыума мясцкома.

Мясцовы камітэт на мінулай канферэнцыі быў падвергнуты крытыцы перш за ўсё за пагаршэнне ў рабоце арганізацыйна-масавай камісіі: адсутнасць кантролю за выкананнем рашэнняў, якія прымаюцца, указвалася, што мясцком практычна адмяжаваўся ад работы з старшынямі прафбюро, што ён не займаўся навучаннем прафактыву. Улічваючы гэтыя крытычныя заўвагі, арганізацыйна-масавая камісія мясцовага камітэта (старшыня Л. А. Ісачанкава) звярнула перш за ўсё ўвагу на неабходнасць удасканалення сістэмы планавання работы прафсаюзных арганізацыі універсітэта.

Мясцовы камітэт рэгулярна адін раз у месяц праводзіў нарады са старшынямі прафбюро, многія пасяджэнні мясцовага камітэта і прэзідыума мясцкома таксама праходзілі з іх удзелам. Гэта садзейнічала, у канчатковым ліку, павышэнню эфектыўнасці прафсаюзнай работы.

Мясцовым камітэтам была звернута ўвага і на арганізацыю вучобы прафсаюзнага актыву. Быў распрацаваны і ў цэлым выкананы план вучобы старшынь прафсаюзных бюро, прадугледжваліся семінары для прафактыву па камісіях мясцкома.

Аднак, трэба прызнацца, што такімі формамі вучобы немагчыма ахапіць увесь прафсаюзны актыў.

МЯСЦОВЫ камітэт лічыў сваім пярвейшым абавязкам садзейнічаць рашэнню асноўных вытворчых задач, якія стаяць перад калектывам універсітэта. Мы імкнуліся максімальна выкарыстаць магчымасці сацыялістычнага спаборніцтва. Пры арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва асноўная ўвага сканцэнтроўвалася на ўдасканаленні вучэбнага працэсу, павышэнні эфектыўнасці ідэйна-выхаваўчай работы са студэнтамі, павышэнні ідэйна-навуковага ўзроўню выкладання, паскарэння ўкаранення новых метадаў і сродкаў навучання, распаўсюджанні перадавога вопыту, дасягненні навуковых вынікаў, якія забяспечваюць прыярытэт айчыннай навукі і тэхнікі, павышэнні эфектыўнасці і якасці навуковых даследаванняў, шырокім прыцягненні да ўдзелу ў іх студэнтаў. Гэтыя паказчыкі шырока ўлічаны ва ўмовах міжфакультэцкага і міжкафедральнага спаборніцтва, распрацаванага вучэбна-навуковай камісіяй (старшыня І. П. Казлоў), і накіраваны на павышэнне эфектыўнасці і якасці работы кожнага выкладчыка, супрацоўніка універсітэта, кожнага калектыву.

Па пытаннях арганізацыі і павышэння эфектыўнасці сацыялістычнага спаборніцтва мы зусім нядаўна вялі размову на прафсаюзным актыве універсітэта. Таму, мабыць, няма неабходнасці вельмі дэталёва аналізаваць гэтае пытанне сёння. Аднак мне хацелася б напомніць дэлегатам канферэнцыі, што мясцовы камітэт звяртаў асаблівую ўвагу на здзяйсненне галоснасці сацыялістычнага спаборніцтва. Створаны экран ходу сацыялістычнага спаборніцтва, рэгулярна абнаўляецца агульнауніверсітэцкі стэнд, які адлюстроўвае яго асноўныя вынікі. На жаль, не ва ўсіх падраздзяленнях яны існуюць.

Вытворчая камісія ўвяла з мінулага года практыку абароны прынятых сацыялістычных абавязацельстваў. Аналіз ходу выканання сацыялістычных абавязацельстваў падраздзяленняў універсітэта пераканаў нас у тым, што іх нярэдка рыхтавалі фармальна, хаця пад кожным з іх стаялі канкрэтныя подпісы і даты.

Каб пазбегнуць стыхійнасці, шаблону ў прыняцці абавязацельстваў, вытворча-масавая камісія прыйшла да вываду аб неабходнасці абароны кожным падраздзяленнем сваіх абавязацельстваў. І трэба сказаць, што з першага разу многія падраздзяленні не змаглі абараніць свае абавязацельствы. Тады і стала ясна, што абарона абавязацельстваў — зусім не жангліраванне доказамі.

Галоўнае — папярэдняя работа па іх падрыхтоўцы. Адсюль я думаю, становіцца зразумелай роля прафсаюзнай групы, з якой і пачынаецца працэс фарміравання сістэмы колькасных і якасных паказчыкаў абавязацельстваў таго ці іншага падраздзялення. Задача прафсаюзных бюро падраздзяленняў — забяспечыць абарону сацыялістычных абавязацельстваў на 1982 год кожнай прафсаюзнай групай, а ў групе — кожным яе членам.

Разам з тым мясцовы камітэт не змог забяспечыць выкананне некаторых абавязацельстваў па ўдасканаленню сацыялістычнага спаборніцтва. Размова ідзе аб тым, што мы не змаглі завяршыць да гэтага часу абмеркаванне ўмоў сацыялістычнага спаборніцтва на XI пяцігодку. Вінавата ў гэтым і агульнауніверсітэцкая камісія па сацыялістычнаму спаборніцтву, якая яшчэ не стала яго сапраўдным штабам.

Новаму саставу мясцовага камітэта, безумоўна, неабходна ў самы бліжэйшы час завяршыць работу па выданню ўмоў сацыялістычнага спаборніцтва на XI пяцігодку.

Мясцовы камітэт не дабіўся яшчэ і ад шэрагу прафсаюзных бюро сур'ёзных адносін да арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. Можна сказаць, што адбылася дакладна бачная дыферэнцыяцыя прафбюро: з аднаго боку, высокая ступень яго арганізацыі — фізічны факультэт, факультэт прыкладной матэматыкі, факультэт радыёфізікі і электронікі, СКТБ з ВВ, бібліятэка, хімфак і іншыя.




У 1979 годзе абком прафсаюза нават абагульняў вопыт арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва на біялагічным факультэце (былы старшыня прафбюро Т. І. Запольская) і рэкамандаваў яго да ўкаранення ў ВНУ г. Мінска.

З другога ж боку — група падраздзяленняў, дзе ўспамінаюць аб сацыялістычным спаборніцтве толькі ў перыяд падвядзення вынікаў і, магчыма, яшчэ пры прыняцці абавязацельстваў. Іх, вядома, не шмат, таму, дазвольце мне, таварышы дэлегаты, не пералічваць гэтыя падраздзяленні, маючы на ўвазе, што вопыт біялагічнага факультэта па арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва новымі саставамі прафбюро будзе хутка ўкаранёны.

Мяжы пошуку новых форм і метадаў у арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва няма і не можа быць. Думаецца, што на сённяшні дзень ва універсітэце ўжо склаліся ў цэлым неабходныя ўмовы для арганізацыі спаборніцтва за ўзорную кафедру, лабараторыю, факультэт.

КАМУНІСТЫЧНАЯ партыя заўсёды ставіла і ставіць у цэнтр усёй сваёй практычнай дзейнасці клопат аб чалавеку працы, аб няўхільным павышэнні жыццёвага ўзроўню савецкіх людзей. «Уважлівыя, клапатлівыя адносіны да чалавека,— падкрэсліваў таварыш Леанід Ільіч Брэжнеў на Кастрычніцкім (1980 г.) Пленуме ЦК КПСС, — павінны пранізваць увесь стыль работы партыйных, савецкіх, гаспадарчых органаў і, зразумела, прафсаюзаў».

Важнейшае значэнне ў гэтым плане мае работа па забеспячэнню здаровых і бяспечных умоў працы. Дзесятая пяцігодка ў цэлым, і апошнія два гады ў прыватнасці, за якія дае справаздачу цяперашні састаў мясцовага камітэта, сталі важнымі па рэалізацыі ў падраздзяленнях універсітэта задачы пераходу ад тэхнікі бяспекі да бяспечнай тэхнікі, якую прапанаваў Генеральны Сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыш Л. І. Брэжнеў на XVI з'ездзе прафсаюзаў. Гэта задача і вызначае ў цяперашні час асноўную накіраванасць работы камісіі па ахове працы і тэхнікі бяспекі, якой паспяхова кіруе старшы навуковы супрацоўнік НДІ ФХП П. М. Гапонік.

На аснове распрацаваных перспектыўных комплексных планаў па ахове працы складаюцца штогадовыя мерапрыемствы для паляпшэння ўмоў работы і вучобы. Толькі на наменклатурныя мерапрыемствы па папярэджанню няшчасных выпадкаў, прафзахворванняў і паляпшэнню санітарна-тэхнічнага становішча універсітэт штогод расходуе 25—50 тысяч рублёў, прычым плануемыя сродкі асвойваюцца з вялікім перавыкананнем. Так, у 1979 і 1980 гадах план расходу складаў 28,3 і 32,0 тысяч рублёў, а выкарыстана 35,2 і 50,0 тысяч рублёў адпаведна. Супрацоўнікі універсітэта, якія звязаны са шкоднымі ўмовамі працы, штогод праходзяць медыцынскі агляд. На працягу апошніх 20 гадоў прафесіянальных захворванняў не выяўлена.

У адпаведнасці з правіламі і палажэннямі, якія існуюць, супрацоўнікі, што працуюць у шкодных умовах, карыстаюцца дадатковымі льготамі — скарочаны рабочы дзень, дадатковы водпуск, павялічваецца на 10—15 працэнтаў зарплата, выдаецца малако. З мэтай павышэння ўзроўню арганізатарскай работы па папярэджанню траўматызму і захворванняў на вытворчасці, шырокага прыцягнення супрацоўнкіаў і студэнтаў да актыўнага ўдзелу ў рабоце па здзяйсненню мерапрыемстваў па павышэнню культуры вытворчасці і аздараўленню ўмоў працы ва універсітэце штогод праводзіцца агляд-конкурс бяспекі працы. У ходзе такога конкурсу толькі на фізічным факультэце ў 1980 годзе сіламі супрацоўнікаў і студэнтаў створана і ўкаранёна ў навуковыя даследаванні і навучальны працэс 12 прылад, якія павышаюць культуру вытворчасці, эфектыўнасць і бяспеку работ і заняткаў, 9 з якіх абаронены аўтарскімі пасведчаннямі. Універсітэт актыўна ўдзельнічае таксама ва Усесаюзным і рэспубліканскім аглядах стану ўмоў і аховы працы. Па выніках конкурсу за 1980 год універсітэту прысуджана 1-е месца сярод ВНУ рэспублікі.

Гаворачы аб рабоце мясцовага камітэта і прафсаюзных бюро па забеспячэнню здаровых умоў працы для супрацоўнікаў універсітэта, нельга не сказаць аб тым, што нягледзячы на вельмі складанае становішча з вытворчымі плошчамі ва універсітэце на фізічным, гістарычным, механіка-матэматычным факультэтах створаны пакоі адпачынку, так званыя прафесарскія, дзе ў перапынку паміж заняткамі можна выпіць чаю, адпачыць пасля лекцыі, сабрацца з думкамі перад чарговымі заняткамі. У гэтых пакоях праводзіцца шмат кафедральных і факультэцкіх мерапрыемстваў: ушанаванне ветэранаў, сустрэчы з цікавымі людзьмі.

ТАВАРЫШЫ! Разам з тым ёсць яшчэ ва універсітэце і шэраг сур'ёзных недахопаў у ахове працы і тэхнікі бяспекі. Тут мы, мясцком, прафсаюзнае бюро, у поўнай меры абавязаны аднесці да сябе словы таварыша Леаніда Ільіча Брэжнева, якія ён сказаў на XXVI з'ездзе КПСС аб тым, «што нашым прафсаюзам часам яшчэ не хапае ініцыятывы ў выкарыстанні іх шырокіх правоў. Яны не заўсёды настойлівыя ў пытаннях калектыўных дагавораў, аховы працы, слаба яшчэ рэагуюць на факты парушэння працоўнага заканадаўства».

Возьмем некалькі прыкладаў. З году ў год пераходзяць з аднаго пагаднення ў другое такія мерапрыемствы па ахове працы як наладка вентыляцыйных сістэм у галоўным і фізічным карпусах, шмат гадоў не могуць набыць указальнікаў напружання. А такі від работы, як збудаванне парапетаў на даху геаграфічнага корпуса, ужо і не ўключаецца ў пагадненне.

З 19 пунктаў пагаднення па ахове працы і тэхніцы бяспекі на 1981 год выканана за 9 месяцаў толькі 8. У ліку перавыкананых ёсць мерапрыемствы і другога квартала. Неабходна дабівацца планамернага выканання пагаднення па кварталах, так як яны запісваюцца, у адпаведнасці з іх важнасцю.

Таварышы! У структуры на-

шага універсітэта ёсць падраздзяленні, дзейнасць якіх аказвае непасрэдны ўплыў на эфектыўнасць і якасць работы ўсіх яго супрацоўнікаў. Гэта—прадпрыемствы грамадскага харчавання. Прафсаюзны камітэт бачыў і бачыць сваю задачу па ўдасканаленню арганізацыі грамадскага харчавання ў тым, каб сталовыя і буфеты сталі і месцам адпачынку для людзей.

Зроблена шмат. Толькі за 1980 і 9 месяцаў 1981 года закуплена тэхналагічнае абсталяванне на многія тысячы рублёў. За гэты час практычна капітальна адрамантаваны ўсе пункты грамадскага харчавання ва універсітэце, павялічылася колькасць пасадачных месц. За якасцю страў, культурай абслугоўвання пастаянна сочаць больш як 80 грамадскіх кантралёраў. Усе буфеты, сталовыя замацаваны за прафсаюзнымі арганізацыямі. Пытанні парушэння грамадскага харчавання неаднаразова абмяркоўваліся на сустрэчах з адказнымі работнікамі гарвыканкома, трэста сталовых і рэстаранаў Маскоўскага раёна. Вельмі актыўны ўдзел у арганізацыі кантролю за сеткай грамадскага харчавання прыняў М. І. Юзэфовіч. Ён арганізаваў вучобу грамадскіх кантралёраў, сам неаднаразова ўдзельнічаў у праверках.

Значная работа праведзена жыллёва-бытавой камісіяй (старшыня Ф. В. Чумакоў). За справаздачны перыяд размеркавана 234 кватэры, разгледжана 981 заява супрацоўнікаў універсітэта. Але становішча з жыллём застаецца вельмі складаным. Толькі 343 сям'і са стажам работы звыш 5 гадоў жывуць у інтэрнатах, на прыватных кватэрах.

Размеркаванне кватэр ажыццяўляецца з самым шырокім абмеркаваннем гэтага пытання грамадскасцю. На падставе выпрацаваных крытэрыяў, зацверджаных на сходзе прафсаюзнага актыву, размеркаванне жылой плошчы ў доме па вуліцы Кузнечнай, пабудаваным для прафесарска - выкладчыцкага саставу, праходзіла спачатку ў падраздзяленнях. Кандыдатуры прадстаўляліся на разгледжанне агульнауніверсітэцкай камісіі па жыллёваму пытанню, у якую на сходзе прафсаюзнага актыву ўключаны людзі, якія карыстаюцца давер'ем і аўтарытэтам у калектыве універсітэта.

Далей дакладчык прааналізаваў работу спартыўна-масавай камісіі, якая значна актывізавала сваю работу ў святле нядаўняй пастановы ЦК КПСС па гэтаму пытанню.

Мясцком шмат зрабіў у плане маральна-этычнага выхавання супрацоўнікаў і іх дзяцей. Створаны танцавальны ансамбль дзяцей супрацоўнікаў, паспяхова праходзяць рэпетыцыі хору народнай песні. Гэтыя калектывы рыхтуюцца да выступлення на юбілейных урачыстасцях. Увогуле камісія мясцкома па культурна-масавай рабоце (старшыня Г. І. Марцінкевіч) і камісія дапамогі сям'і і школе (старшыня С. В. Лузгіна) працавалі плённа. К прыкладу, заслугай апошняй камісіі з'яўляецца тое, што за два гады атрымана 193 месцы ў дашкольных установах для дзяцей супрацоўнікаў.

За справаздачны перыяд шмат супрацоўнікаў атрымалі пуцёўкі ў дамы адпачынку, пансіянаты. Упершыню 45 сем'яў правялі адпачынак на Чорным і Азоўскім марах, многія цікава правялі свой вольны час на Нарачы, а таксама на геастацыі «Заходняя Беразіна».

САВЕЦКІЯ прафсаюзы ўступілі ў адзінаццатую пяцігодку, цесна аб'яднанымі вакол Камуністычнай партыі. Узброеныя рашэннямі XXVI з'езда КПСС, прафсаюзныя арганізацыі універсітэта закліканы ствараць у сваіх калектывах абстаноўку высокай патрабавальнасці, арганізаванасці, дысцыпліны, творчых адносін да справы, каб кожны выкладчык, супрацоўнік, студэнт і калектыў ВНУ ў цэлым працавалі больш эфектыўна і творча.

# ПАСТАНОВА

## XXV ПРАФСАЮЗНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад старшыні мясцовага камітэта таварыша Э. В. Шастаковіча «Справаздача аб рабоце мясцовага камітэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна за перыяд з лістапада 1979 па кастрычнік 1981 г.,» канферэнцыя універсітэта пастанаўляе:

1. Прызнаць работу мясцкома за справаздачны перыяд здавальняючай.

2. Абавязаць усіх членаў прафсаюза актыўна ўдзельнічаць у далейшым выкананні гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

Уноў выбранаму мясцкому з гэтай мэтай забяспечыць далейшае паляпшэнне арганізатарскай і выхаваўчай работы прафарганізацый. Прадоўжыць практыку комплекснага планавання работы прафгруп, прафбюро і мясцовага камітэта; стварыць умовы для поўнай інфармацыі аб прымаемых рашэннях і іх рэалізацыі. Арганізаваць выязныя пасяджэнні прэзідыума МК і мясцовага камітэта ў падраздзяленнях універсітэта з мэтай абмеркавання пытанняў практычнага здзяйснення задач вучэбнай, метадычнай, навукова-даследчай работы, выканання сацыялістычных абавязацельстваў, аховы працы і тэхнікі бяспекі.

Мясцоваму камітэту і прафбюро сістэматычна праводзіць работу па павышэнню дзейснасці сацыялістычнага спаборніцтва, дабіцца яго шырокай галоснасці і эфектыўнасці, ва ўсіх падраздзяленнях арганізаваць і рэгулярна весці экраны сацыялістычнага спаборніцтва. Шырэй практыкаваць сістэму конкурсаў на лепшую вучэбную і навукова-даследчую лабараторыю, узорную кафедру, лабараторыю, факультэт. Стварыць метадычны кабінет прафсаюзнай работы.

3. Мясцоваму камітэту, прафсаюзным бюро факультэтаў, агульнауніверсітэцкіх кафедр і іншых падраздзяленняў забяспечыць далейшае паляпшэнне вытворчай работы. Сістэматычна кантраляваць размеркаванне і выкананне вучэбнай нагрузкі, індывідуальных планаў метадычнай і навукова-даследчай работы, дабіцца лепшага выкарыстання кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў вучэбным працэсе. Садзейнічаць больш шырокаму ўкараненню ў вучэбны працэс ТСН і праграміраваных метадаў навучання. Аказаць практычную дапамогу ўсім падраздзяленням, прафгрупам у наладжванні вытворчай работы, арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, ва ўмацаванні працоўнай дысцыпліны. Мясцоваму камітэту палепшыць кантроль за вытворчай дзейнасцю нізавых прафсаюзных арганізацый.

4. Мясцоваму камітэту, прафсаюзным бюро звярнуць асаблівую ўвагу на далейшае павышэнне эфектыўнасці навукова-даследчай работы, садзейнічаць давядзенню кожнай навуковай распрацоўкі да ўзроўню вынаходніцтва. Актывізаваць работу НТТ і УТВР. Усямерна пашыраць рады членаў навукова-тэхнічных таварystваў, таварыства рацыяналізатараў і вынаходнікаў. Садзейнічаць далейшаму ўкараненню рацыяналізатарскіх прапаноў, метадычных распрацовак і вынаходніцтваў у вучэбны працэс і ў вытворчасці.

5. Мясцоваму камітэту, прафсаюзным бюро ўздымаць значэнне і ролю калектыўных дагавораў, сходаў, вытворчых нарад. Павышаць адказнасць гаспадарчых кіраўнікоў за своечасовае выкананне рашэнняў і рэкамендацый, якія прымаюцца на сходах і нарадах, а таксама крытычных заўваг і прапаноў.

6. Мясцоваму камітэту палепшыць работу ў філіяле БДУ «Шчамысліца». Сумесна з адміністрацыяй здзейсніць меры па паляпшэнню ўмоў працы, грамадскага харчавання, медыцынскага абслугоўвання. У філіяле БДУ «Шчамысліца» арганізаваць работу здраўпункта, упарадкаваць работу сталовых і буфетаў, абсталяваць стадыён, забяспечыць узорнае добраўпарадкаванне тэрыторыі.

7. Абавязаць мясцовы камітэт і прафсаюзнае бюро падраздзяленняў сумесна з адміністрацыяй забяспечыць распрацоўку і рэалізацыю комплексных планаў паляпшэння ўмоў, аховы працы і санаторна - аздараўленчых мерапрыемстваў на 1982 год і наступныя гады XI пяцігодкі, выкананне пастановы Савета Міністраў СССР і ВЦСПС ад 25 красавіка 1979 года «Аб дадатковых мерах па паляпшэнню ўмоў працы і быту жанчын, занятых у народнай гаспадарцы». Прадугледзіць уключэнне ў калектыўныя дагаворы канкрэтных мерапрыемстваў па паляпшэнню ўмоў працы і быту жанчын, аказанні ім дапамогі ў выхаванні дзяцей. Палепшыць дзейнасць камісій па ахове працы, узняць ролю і адказнасць тэхнічных інспектараў. Распрацаваць умовы і правесці конкурс «Лепшы інспектар аховы працы і тэхнікі бяспекі».

8. Мясцоваму камітэту і прафбюро прымаць актыўны ўдзел у рэалізацыі планаў падрыхтоўкі і павышэнні кваліфікацыі навукова-педагагічных кадраў. Праявіць клопат аб развіцці аспірантуры, удзельнічаць у падборы кандыдатур у аспірантуру. Узмацніць работу па прафарыентацыі школьнікаў і працоўнай моладзі, садзейнічаць паляпшэнню работы школ юных.

9. Лічыць адной з важнейшых задач мясцовага камітэта, спартыўна-масавых камісій прафбюро падраздзяленняў універсітэта, кожнага працоўнага калектыву актыўную і паслядоўную работу па выкананню пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб пад'ёме масавасці фізічнай культуры і спорту».

Сканцэнтраваць галоўную ўвагу на шырокім прыцягненні супрацоўнікаў, моладзі да заняткаў фізічнай культурай і спортам непасрэдна па месцу работы і жыхарства.

Палепшыць ва універсітэце прапаганду фізкультуры, спорту і турызму, сканцэнтраваўшы ўвагу на развіцці патрэбы ў людзей да штодзённых заняткаў фізкультурай, шырэй папулярызаваць комплексы практыкаванняў для розных узроставых груп. Больш эфектыўна выкарыстоўваць у якасці асноўных форм і сродкаў масавай фізкультурна - аздараўленчай работы комплекс ГПА, групы «Здароўе», секцыі загартоўвання, секцыі аматараў бегу і іншыя. Актывізаваць малыя спартакіяды «Здароўе» ў падраздзяленнях, спаборніцтвы па комплексу ГПА. Больш інтэнсіўна весці работу па стварэнню ва універсітэце неабходных умоў для заняткаў фізічнай культурай і спортам, умацаванню спартклуба і калектываў фізкультуры падраздзяленняў.

10. Мясцоваму камітэту, прафсаюзным бюро павысіць узровень культурна-масавай работы, шырэй развіваць мастацкую і выяўленчую творчасць супрацоўнікаў універсітэта і іх дзяцей. Увесці ў практыку работы правядзенне ў падраздзяленнях і ва універсітэце конкурсаў па асобных жанрах мастацкай самадзейнасці (мастацкае чытанне, танцы, песня, харавыя спевы і г. д.). Арганізаваць пастаянна дзеючую выстаўку мастацкай творчасці супрацоўнікаў і іх дзяцей.

11. Мясцоваму камітэту сістэматычна займацца пытаннямі далейшага паляпшэння жыллёвых умоў выкладчыкаў і супрацоўнікаў, паляпшэння ўмоў іх быту і адпачынку. Дабівацца своечасовага ўводу ў дзеянне новага жылога дома для прафесарска - выкладчыцкага саставу па вуліцы Кузнечнай. Адміністрацыі звярнуць увагу на стварэнне больш спрыяльных умоў для арганізацыі адпачынку супрацоўнікаў на возеры Нарач і на Валожынскай геастанцыі.

12. Актывізаваць работу камісіі па грамадскаму харчаванню, дабівацца далейшага паляпшэння работы сталовых і буфетаў у вучэбных карпусах і інтэрнатах, найбольш зручнага рэжыму іх працы, укаранення прагрэсіўных форм і павышэння якасці абслугоўвання.

13. Прафсаюзным арганізацыям універсітэта забяспечыць безумоўнае выкананне прынятых сацыялістычных абавязацельстваў на 1981 год — год 60-гадовага юбілею універсітэта. Мясцоваму камітэту своечасова падвесці вынікі сацыялістычнага спаборніцтва ў юбілейным годзе, шырока асвятляць яго вынікі ў газеце «Беларускі універсітэт», прыняць актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні юбілейных урачыстасцей. Прафгрупам, мясцоваму камітэту распрацаваць і прыняць сацыялістычныя абавязацельствы на 1982 год.

14. Уноў выбранаму мясцоваму камітэту абагульніць крытычныя заўвагі і прапановы, выказаныя на данай канферэнцыі, а таксама на справаздачна-выбарных сходах у падраздзяленнях універсітэта. Распрацаваць план іх рэалізацыі, рэгулярна інфармаваць грамадскасць аб ходзе іх выканання на сходах, праз шматтыражную газету, насценны друк.

15. Справаздачна - выбарная канферэнцыя Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна выказвае ўпэўненасць у тым, што прафесарска-выкладчыцкі састаў, супрацоўнікі універсітэта паспяхова выканаюць задачы, якія паставіў перад вышэйшай школай XXVI з'езд КПСС, XXIX з'езд Кампартыі Беларусі, XVI з'езд прафсаюзаў СССР, і якія накіраваны на павышэнне якасці падрыхтоўкі спецыялістаў, эфектыўнасці навукова-даследчай работы.

**● УВАГА: КОНКУРС!**

# ПРЫСВЯЧАЕЦЦА XXVI З'ЕЗДУ КПСС

ВУЧОНЫЯ нашага універсітэта заўсёды прымалі актыўны ўдзел у Рэспубліканскіх конкурсах. У 1980 годзе лаўрэатамі VI Рэспубліканскага конкурсу работ маладых вучоных і спецыялістаў па грамадскіх навуках, прысвечанага 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, сталі Л. Цітарэнка, А. Байчораў, Я. Гурко, Л. Дзяменцьева, Н. Дзенісюк, Ю. Івонін, С. Плужнікаў, Т. Румянцава, В. Сяргеенкава, Н. Цыркун. Яны былі ўзнагароджаны дыпломамі і грашовымі прэміямі.

У кастрычніку 1981 — студзені 1982 года праводзіцца VII Рэспубліканскі конкурс работ маладых вучоных і спецыялістаў па грамадскіх навуках, прысвечаны XXVI з'езду КПСС.

Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца аўтары выданых кніг, брашур, артыкулаў, якія апублікаваны, а таксама рукапісаў (аб'ём рукапісаў — не менш трох друкаваных аркушаў) па філасофіі, навуковаму камунізму, палітычнай эканоміі, гісторыі КПСС, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, педагогіцы і праблемах камуністычнага выхавання моладзі. На 1 студзеня 1982 года ўзрост аўтараў не павінен перавышаць 33 гады. Конкурс праходзіць у два туры. Лепшыя работы прадстаўляюцца ў лістападзе 1981 года на другі тур конкурсу, які завяршаецца ў студзені 1982 года. Работы на конкурс прымаюцца ў двух экземплярах да канца кастрычніка 1981 года ў камітэце камсамола універсітэта, а таксама членамі Савета маладых вучоных А. Новікавай, В. Сяргеенкавай і Я. Яськевіч.

**В. СЯРГЕЕНКАВА,**
**член Савета маладых вучоных.**

**● З НАШАЙ ПОШТЫ**

# СЯБРЫ ПОБАЧ

ШТОГОД замежныя студэнты прыязджаюць у Савецкі Саюз на вучобу, каб тут атрымаць веды, неабходныя для таго, каб стаць добрымі спецыялістамі і ў далейшым усё ўменне і старанне аддаць на карысць сваёй Радзімы. Галоўная перашкода для нас— слабае веданне рускай мовы. Але я і мае сябры маем магчымасць у любы час звярнуцца за дапамогай да савецкіх студэнтаў. І яны ніколі не адмовяцца: растлумачаць незразумелае, дапамогуць разабрацца ў новым вучэбным матэрыяле.

Вось, напрыклад, што гавораць аб гэтым студэнты.

**Лувсангомбыт Энхбат (Манголія):**

— Калі я прыехаў у Савецкі Саюз, вельмі дрэнна ведаў рускую мову. Але ў пастаянных зносінах з савецкімі студэнтамі добра стаў размаўляць. Дзякуючы сваім аднакурснікам, я стаў чытаць самастойна творы рускіх і савецкіх пісьменнікаў: Тургенева, Гогаля, Шолахава. Пастаянна мне дапамагалі Саша Лазоўскі, Сяргей Багдановіч. У гэтым годзе я таксама жыву з савецкімі рабятамі. І калі мне што-небудзь незразумела, ведаю — яны заўсёды дапамогуць.

**Сабах Абдуль Рахман (Ірак):**

— Я займаюся на III курсе факультэта журналістыкі. Цяпер праходжу практыку ў газеце «Знамя юности». Гэта цяжкі і адказны час для мяне. Але побач — надзейны і верны сябар Валодзя Прачуханаў, студэнт V курса. Ён падрабязна расказвае, як трэба збіраць факты, каб атрымаўся добры матэрыял.

У адным пакоі з намі жыве Коля Давідзюк. Але ён зараз у Брэсце на практыцы. І я з нецярплівасцю чакаю яго вяртання, каб разам абмеркаваць тыя ці іншыя праблемы, паслухаць вершы, якія піша ён сам.

У многім мне дапамагаюць таксама Коля Касяк, Лёша Веруш. Мне вельмі падабаецца, напрыклад, калі Лёша чытае вершы Сяргея Ясеніна. Пад яго ўплывам я сам пачаў цікавіцца творамі гэтага паэта.

**Жаржын РАВАУ,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**

**НАШЫ ЮБІЛЯРЫ**

# ЯГО НАТХНЁНАЕ СЛОВА

**СПОЎНІЛАСЯ 50 ГАДОЎ НІЛУ СЯМЁНАВІЧУ ГІЛЕВІЧУ — ВЯДОМАМУ БЕЛАРУСКАМУ ПАЭТУ І ВУЧОНАМУ, ЗАСЛУЖАНАМУ ДЗЕЯЧУ НАВУКІ БССР, ЛАЎРЭАТУ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ БССР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ.**

Творчасць Ніла Гілевіча — гэта яркая старонка сучаснай беларускай паэзіі, запаветнае слова пра Бацькаўшчыну і народ, натхнёная песня пра чалавека і прыгажосць яго душы. Да свайго паўстагоддзя паэт падышоў, маючы 10 паэтычных зборнікаў, а таксама некалькі сатырычных і гумарыстычных кніг, выданні для дзяцей, п'есы, пераклады з балгарскай, славенскай, сербскахарвацкай і іншых моў.

25 гадоў актыўнай жыццёвай і творчай дзейнасці звязаны ў Н. С. Гілевіча з Беларускім дзяржаўным універсітэтам. Тут ён вучыўся на філалагічным факультэце, а затым у аспірантуры. Пачынаючы з 1960 года, паэт працуе на кафедры беларускай літаратуры, дзе ён прайшоў шлях ад выкладчыка да прафесара.

Яшчэ ў студэнцкія гады Н. С. Гілевіч пачаў выступаць у друку з крытычнымі артыкуламі і рэцэнзіямі. Але першым сур'ёзным даследаваннем стала манаграфія «Акрыленая рэвалюцыяй» (1962 г.), якая вырасла на аснове кандыдацкай дысертацыі пра паэзію «Маладняка». Кола інтарэсаў Н. С. Гілевіча як даследчыка і прытыка даволі шырокае: Я. Купала і М. Багдановіч, П. Панчанка і С. Дзяргай, В. Вітка і К. Крапіва, творчасць маладых. Ва ўсіх крытычных і публіцыстычных артыкулах Н. С. Гілевіча, сабраных у кнігу з характэрнай назвай «У гэта веру» (1978), ярка выяўлена творчая індывідуальнасць самога аўтара, яго грамадзянская пазіцыя і эстэтычныя крытэрыі.

З найбольшай сілай талент даследчыка праявіўся ў фальклорыстычнай дзейнасці Н. С. Гілевіча. Тэарэтычныя праблемы беларускай фалькларыстыкі распрацаваны ім у манаграфіях «Наша родная песня» (1968), «З клопатам пра песні народа» (1970), «Паэтыка беларускай народнай лірыкі» (1975), «Паэтыка беларускіх загадак» (1976). Грунтоўны аналіз мастацкай прыроды і паэтычнай структуры фальклорных жанраў спалучаецца тут з прапагандай і папулярызацыяй скарбаў народнай духоўнай культуры.

Чытаючы курс беларускага фальклору, кіруючы студэнцкім навуковым гуртком і спецсемінарам па паэтыцы фальклорных жанраў, Н. С. Гілевіч стаў арганізатарам і навуковым кіраўніком збіральніцкай работы, маштабы і значэнне якой цяжка пераацаніць. Заслужаны аўтарытэт прынеслі Н. С. Гілевічу выданні беларускага фальклору «Песні сямі вёсак» (1973), «Песні народных свят і абрадаў» (1974), «Лірычныя песні» (1976), «Лірыка беларускага вяселля» (1979), укладальнікам і навуковым рэдактарам якіх ён з'яўляецца. Артыкулы Н. С. Гілевіча ў гэтых зборніках — самастойныя навуковыя даследаванні сучаснага стану бытавання традыцыйнай народнай паэзіі і спецыфікі песенных жанраў.

Арыгінальны мастацкі талент, багатая эрудыцыя і шчыры клопат аб развіцці роднай культуры і захаванне яе скарбаў заўсёды збіралі Н. С. Гілевічу аўдыторыю ўдзячных слухачоў. Яго ўплыў на фарміраванне некалькіх пакаленняў філолагаў надзвычай вялікі. Сёння якасці, якія выпрацаваліся за час педагагічнай работы ў БДУ, служаць Н. С. Гілевічу на пасадзе першага сакратара Саюза пісьменнікаў БССР.

**Л. ТАРАСЮК,**
**кандыдат філалагічных навук, выкладчыца кафедры беларускай літаратуры.**

**● ЗАВОЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ЧЫТАЧОЎ**

## *«Беларускі універсітэт»-82*

**Нямнога часу засталося да тае пары, калі перагорнецца апошняя старонка календара 1981, і мы ўжо мяркуем аб тым, якой будзе наша газета ў новым, 1982 годзе. Аналізуем зробленае, абдумваем новае. Матэрыялы чытачоў, іх думкі — надзейныя арыенціры ў гэтай рабоце. Чакаем вашых прапаноў, чытачы!**

**Гэты год праходзіць пад знакам вялікай падзеі ў жыцці нашай ВНУ — 60-годдзя з дня нараджэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Як асвятляла газета слаўныя справы студэнцтва, універсітэцкіх вучоных, што павінна яна зрабіць, каб яшчэ хутчэй рос лік карысных спраў флагмана вышэйшай школы рэспублікі? Пішыце нам, на якіх факультэтах, у якіх падраздзяленнях БДУ можна пазнаёміцца з цікавымі, патрэбнымі пачынаннямі, чый вопыт камсамольскай, вучэбнай, навуковай работы заслугоўвае распаўсюджання.**

**Што з прачытанага ў «Беларускім універсітэце»-81 усхвалявала вас? Якія тэмы і рубрыкі параіце прадоўжыць? Прапануйце новыя.**

**На шляху кожнага студэнта, будучага спецыяліста сустракаецца шмат складаных задач. Якія з іх, на вашу думку, нам неабходна абмеркаваць?**

**Ці дастаткова асвятляецца ў газеце інтэрнацыянальная тэма, ці цікавяць вас матэрыялы аб трэцім працоўным семестры, аб адпачынку студэнтаў.**

**Універсітэт ганарыцца сваімі выкладчыкамі, педагогамі, вучонымі, студэнтамі, выдатнікамі. Аб кім з іх вы хацелі б прачытаць у газеце?**

**Ці задаволены вы дзейснасцю выступленняў «Беларускага універсітэта»? Напэўна, не ўсе матэрыялы газеты ў 1981 годзе вам спадабаліся. Чаму?**

**Ці рэгулярна вы чытаеце газету, як наладжана яе распаўсюджанне на вашым факультэце, падраздзяленні і г. д.?**

**Пішыце, заходзьце, мы заўсёды рады сустрэчы з вамі!**

**Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт».**



Кастрычнік на двары. Фотаэцюд **В. Шачака.**

**● ЗАПРАШАЕ ФГП**

## КАБ СТАЦЬ РОЗНАБАКОВЫМ

ТЫ ПРЫЙШОЎ ва універсітэт, каб стаць біёлагам ці матэматыкам, філолагам, фізікам ці юрыстам і таму, зразумела, сёння твой асноўны час ідзе на назапашванне неабходных прафесійных ведаў. Ты марыш стаць асобай рознабаковай, развіць у гады студэнцтва творчыя задаткі, якія ёсць, безумоўна, у кожнага, а таксама набыць канкрэтны вопыт грамадска-палітычнай работы. І таму цябе абавязкова зацікавіць яркая, маляўнічая аб'ява універсітэцкага факультэта грамадскіх прафесій з запрашэннем на вучобу.

12 аддзяленняў ФГП чакаюць тых, хто імкнецца набыць навыкі і веды па асновах арганізацыі грамадска-палітычнай работы, авалодаць лектарскім майстэрствам, набыць спецыяльнасць мастака-афарміцеля ці кіраўніка агітбрыгады. Методыку пошукавай і прапагандысцкай работы прапануе ваенна-патрыятычнае аддзяленне. Аматары спорту атрымаюць магчымасць набыць навыкі судзейства і грамадскага інструктажу по розных відах. Фотааматараў чакае знаёмства з асновамі фотасправы, а таксама з фотакарэспандэнцкай дзейнасцю. Спасцігнуць таямніцы валодання словам дапамогуць аддзяленні мастацкага слова, журналістыкі, дыктараў і вядучых. Запрашае ФГП і тых, хто цікавіцца бальнымі танцамі і харэаграфіяй.

На працягу года ці двух, у залежнасці ад выбранай спецыялізацыі, нашым слухачам прадстаіць знаёмства з любімым грамадскім заняткам у разнастайных формах: лекцыі, сустрэчы, дыскусіі, рэпетыцыі, трэніроўкі. Урачысты выпуск у канцы вучобы — прызнанне прафесійнай падрыхтоўкі па адной з грамадскіх спецыялізацый, якое дакументальна пацвярджаецца спецыяльным пасведчаннем. Разам з дыпломам ВНУ яно стане для кожнага з вас пуцёўкай у жыццё.

**Г. ФАЛЬКОЎСКАЯ,**
**метадыст факультэта грамадскіх прафесій.**

**● ВОСЕНЬСКАЕ ВЫПРАБАВАННЕ**

# АД ПРАЦЫ КОЖНАГА

60 ПЕРШАКУРСНІКАЎ мехмата, студэнтаў вытворчага патоку і механікаў, у саставе ССГА, камандзірам якога быў прызначаны супрацоўнік кафедры геаметрыі Уладзімір Васільевіч Сувораў, працавалі на ўборцы ўраджаю ў двух гаспадарках Чавускага раёна Магілёўскай вобласці.

Брыгадай, якая дыслацыравалася ў калгасе «Перамога» быў заключаны з праўленнем дагавор на акордны нарад, па якому студэнты абавязаліся за сем дзён убраць 5 гектараў ільну. Праз пяць дзён убрана было ўжо 5,5 гектара. І не дзіўна,—на 200—250 працэнтаў у дзень выконвалі норму нашы дзяўчаты. Тон у працы задавалі Люба Марачкоўская, Таня Грушэўская, Вольга Атрошчанка.

Брыгада, што размясцілася ў калгасе імя Ільіча, з першых дзён была занята на ўборцы бульбы. Звяно Галі Эсмантовіч ударна працавала на бульбаўборачных камбайнах. Ніводнай лішняй хвіліны не прастойвала калгасная тэхніка. Нават дажджлівае надвор'е не перашкаджала працоўнаму энтузіязму. Не адставалі ад сяброваk дзяўчаты са звяна Раісы Самусік. 150—160 працэнтаў нормы выдавалі яны штодзень на сартавальным пункце. Усе астатнія работы, у тым ліку і загрузку бульбы, выконвалі Алег Дашэвіч, Віктар Драгун і іншыя рабяты.

Добрымі працаўнікамі паказалі сябе нашы першакурснікі. Але яны да таго ж — выдатныя арганізатары, цікавыя, эрудзіраваныя, падобраму неспакойныя людзі. Аб гэтым сведчаць зробленыя для мясцовай школы і з мастацкім густам афармленыя стэнды па прафарыентацыі; пяць лекцый, прысвечаных Дню Канстытуцыі, з якімі студэнты выступілі перад працаўнікамі вёсак; лекцыя пра Эйнштэйна для школьнікаў; а таксама цікавая і змястоўная гутарка «Аб дружбе, аб сяброўстве, аб каханні», якую правяла са старшакласнікамі Святлана Аўчыннікава.

Шмат мясцовых гледачоў сабраў канцэрт атраднай агітбрыгады, які адбыўся ў клубе калгаса імя Ільіча. А студэнты, у сваю чаргу, усхвалявана слухалі выступленне знатнага механізатара калгаса Ніны Якаўлеўны Гулідавай, узнагароджанай ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём «Ветэран працы» і «Медалём мацярынства» II ступені.

Закончыліся верасьнёўскія працоўныя будні. Прыйшоў час азірнуцца і падвесці вынікі. Безумоўна, кожны з байцоў атрада ў час работы разумеў, што мы не проста прыехалі ў калгас адпрацаваць некалькі тыдняў — нам даручана прыняць удзел у важнай народнай справе, якой з'яўляецца ўборка ўраджаю. Адсюль нашы поспехі.

Граматай Чавускага райкома партыі і райвыканкома за ўдарную працу і актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ўзнагароджана Галя Эсмантовіч. Граматы райкома камсамола былі ўрачыста ўручаны Наташы Дубовік, Віктару Драгуну, Раісе Самусік, Любе Марачкоўскай. Атрад атрымаў грамату праўлення калгаса «Перамога» і кіраўніцтва Дужаўскай сярэдняй школы.

А яшчэ працоўная восень на калгасных палях згуртавала і аб'яднала студэнцкі атрад першакурснікаў, дапамагла ямуператварыцца ў сапраўдны, правераны калектыў.

На першым атрадным зборы мы прынялі дэвіз: ад працы кожнага залежаць агульны поспех, важкасць нашага ўкладу ў важную справу. Сваёй работай мы гэты дэвіз апраўдалі.

**Г. АТРОШЧАНКА,**
**камісар атрада.**

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

**Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.**

**15 кастрычніка 1981 г.**
Заказ 1628 АТ 3446

**220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.**

**ТЭЛЕФОН 20-68-27.**

**Рэдактар**
**В. П. ВАРАБ'ЁЎ**